ПАДЗЕЯ



# ІНШЫХ ШЛЯХОЎ НЕ ДАДЗЕНА



**НЯСВІЖ. У Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Нясвіж» прайшоў ІІІ Міжнародны праваслаўны фестываль духоўнай творчасці «Богародице похвалу воспоём». Прадстаўнічы творчы форум, што праводзіцца тут штогод, аб'яднаў паэтаў і бардаў, перакладчыкаў, публіцыстаў, дэкламатараў з Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей Беларусі. Традыцыйна ў яго праграме актыўны ўдзел прымае дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале са старшынёй, заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь Людмілай Антонаўнай Кебіч.**

Заснавальнікамі і арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца Саюз пісьменнікаў Беларусі і Беларуская Праваслаўная Царква. Яго ідэйныя натхняльнікі – член СПБ, паэтэса, празаік, краязнаўца, радыёвядучая Зоя Мікалаеўна Кулік і Епіскап Нясвіжскі Аўксенцій, вікарый Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі.

Двухдзённая праграма ІІІ Фестывалю духоўнай творчасці «Богародице похвалу воспоём» змясціла мноства падзей і мерапрыемстваў. Мэтай форуму, які прымеркаваны адразу да некалькіх прастольных праваслаўных святаў – Раства Прасвятой Багародзіцы, Узвіжання Сумленнага і Жыватворчага Крыжа Гасподняга, Пакрова Прасвятой Багародзіцы – традыцыйна з'яўляецца духоўная асвета праз мастацкае слова. А слова, як вядома, было ў самым пачатку. І яно было ў Бога.

Значнай падзеяй стала выступленне на фестывальнай сцэне Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Веніяміна *(на фота).* Уладыка Веніямін асабіста блаславіў гасцей, удзельнікаў, арганізатараў праваслаўнага фестывалю і падкрэсліў надзвычай актуальную і эфектыўную ролю мастацтва ў справе духоўнага ўдасканалення нашага жыцця, гуманістычнага і патрыятычнага выхавання моладзі, маральнага ачышчэння сучаснага грамадства.



Сярод актыўных удзельнікаў III Міжнароднага праваслаўнага фестывалю духоўнай творчасці «Богородице похвалу воспоём» члены СПБ, вядомыя ў рэспубліцы пісьменнікі з Гродна і Гродзенскай вобласці Людміла Кебіч, Дзмітрый Радзівончык, Вольга Алізар, Галіна Богдан (Ліна Багданава), Ірына Салата, Таццяна Яцук, Аляксандр Марозаў, а таксама члены Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея», паэтэса, перакладчык Сафія Судзьіна і паэт, празаік, публіцыст, перакладчык Станіслаў Вішнеўскі. Разам з літаратарамі на фестывалі выступілі іх верныя сябры бібліятэкары, напрыклад, дырэктар Слонімскай раённай бібліятэкі імя Я. Коласа Тамара Гайдук.

Для кожнага была адведзена свая функцыя, свая творчая роля. Да прыкладу, Людміла Антонаўна Кебіч узначаліла журы конкурснай праграмы, а яшчэ па даручэнні кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў Беларусі выступала з уступным прывітальным словам і аглядамі дзейнасці пісьменніцкай арганізацыі. Дзмітрый Мікалаевіч Радзівончык як публіцыст выступіў з дакладам на навукова-практычнай канферэнцыі «Прафесійныя кампетэнцыі сучаснага літаратара і іх сацыякультурныя функцыі», а таксама ў тандэме з паэтэсай Таццянай Мікалаеўнай Яцук выканаў ролю вядучага паэтычна-песеннага фестывальнага марафону, які доўжыўся больш за тры гадзіны.

Нельга не адзначыць, што, як і на папярэднім вераснёўскім літаратурным форуме ў Касцюковічах, у Нясвіжы літаратары Прынёмання сталі абсалютнымі лідарамі па колькасці занятых прызавых месцаў і заваяваных дыпломаў розных конкурсных намінацый. Да прыкладу, паэтка Вольга Алізар стала прызёрам адной з іх, а ў другой заваявала Гран-пры.





Нашы калегі праявілі сябе шматграннымі талентамі ў розных творчых амплуа – паэтаў, празаікаў, перакладчыкаў, публіцыстаў, аўтараў песень і нават народных майстроў-рукадзельніц (паэтэса Вольга Алізар вышыла на ручніку свой паэтычны цыкл малітваў).





Да беларускіх пісьменнікаў па традыцыі далучылася расійская дэлегацыя на чале з членам Саюза пісьменнікаў Расіі, заслужаным дзеячам культуры Расійскай Федэрацыі, паэтэсай Аленай Асатуравай. Паўдзельнічаць у III Міжнародным праваслаўным фестывалі духоўнай творчасці «Богородице похвалу воспоём» можна было і завочна, – хрысціянскія творы дзясяткаў таленавітых аўтараў з розных куткоў Беларусі знайшлі сваё месца на старонках унікальнай тэматычнай кнігі «Матерь Божия – Матерь Жизни», зборніка матэрыялаў фестываляў мінулых гадоў.

У адным з найпрыгажэйшых гістарычных месцаў, ахутаным таямніцамі і легендамі, вядомым як Нясвіжскі замак, адбылася падзея, якая прыпадняла людзей над тленнасцю і мітуснёй матэрыяльнага свету, з дапамогай апетай у слове святой любові у душах людзей запанавалі спакой і паміратаўленне. У каторы раз буйны хрысціянскі форум красамоўна пацвердзіў тэзіс: толькі згода і мірная стваральная праца, пошук гармоніі і любоў да бліжняга – іншых шляхоў нам не дадзена.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** незабыўныя эпізоды III Міжнароднага праваслаўнага фестывалю духоўнай творчасці «Богородице похвалу воспоём». Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», Мінская вобласць, 25-26 верасня 2026 года.









З. М. Кулік






Л. А. Кебіч







Уладыка Аўксенцій: падзякі творцам ад Беларускай Праваслаўнай Царквы



Л. А. Кебіч: прывітальнае слова ад Саюза пісьменнікаў Беларусі




На фестывальнай сцэне Марына Лайкова



Т. М. Яцук




З вядучай дзіцячай творчай праграмы,
членам СПБ, паэтэсай Валянцінай Драбышэўскай








А. У. Асатурава


ДАЙ ПЯТЬ ДОБРУ




2
3
4







Уладыка Веніамін







Падарункі для Уладыкі Аўксенція









Ліна Багданава і Людміла Кебіч на экскурсіі



І. А. Салата




С. В. Вішнеўскі




Ліна Багданава




ТЕАТР-ЭКСПРОМТ




Людміла Кебіч і Юрась Мазалевіч












Дзмітрый Радзівончык
і Таццяна Яцук




Т. Б. Гайдук



















www.pisateli.by